13. Невельская-Гордеева, Е. П. Дауншифтинг как мировоззренческая проблема нравственной философии / Е. П. Невельская-Гордеева // Журнал «Междисциплинарные исследования в науке и образовании». 2012. – № 1 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://mino.esrae.ru/pdf/2012/1%20Sp/736.doc. – Дата доступа : 03.01.2019.
14. Франция вводит цензуру в СМИ. Почему Макрон боится RT и Sputnik [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://новости-мира.ru-an.info/. – Дата доступа : 03.01.2019.

**Вікторыя ПЯТКЕВІЧ**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(г. Мінск, Беларусь)*

# ТЭМАТЫКА РАДЫЁВЯШЧАННЯ НА ЗАМЕЖНЫЯ КРАІНЫ Ў ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У артыкуле разглядаюцца ключавыя тэматычныя кірункі радыёвяшчання на замежныя краіны з Рэспублікі Беларусь у перыяд станаўлення незалежнай дзяржавы (пачатак 90-х гг. XX ст.). Аналізуюцца мікрафонныя папкі радыёстанцыі «Беларусь» за 1992 г., акрэсліваюцца асаблівасці асвятлення палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сфер у радыёэфіры.

*Ключавыя словы:* радыёвяшчанне на замежныя краіны; радыёстанцыя «Беларусь»; тэматыка вяшчання.

The article reviews the key topical areas of the foreign countries' broadcasts from the Republic of Belarus in the period of formation of an independent state (1990s). The microphone folders of the radio station «Belarus» (1992) are analyzed, the specifics of the coverage of political, social, economic and cultural spheres on the radio are outlined.

*Key words:* foreign countries' broadcasts; radio station «Belarus»; broadcast topics.

Палітычныя пераўтварэнні 90-х гг. XX ст. сталі прычынай актыўнага фарміравання сістэмы сродкаў масавай інфармацыі ў незалежнай Беларусі. Распад СССР і з'яўленне на карце свету самастойнай беларускай дзяржавы істотна змяніла тэматычную палітру і сэнсавае напаўненне айчынных СМІ, якія працавалі як на ўнутраную, так і на знешнюю аўдыторыю. Галоўная рэдакцыя радыёвяшчання на замежныя краіны, якая з'яўляецца структурным падраздзяленнем Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, была створана яшчэ ў 1962 г., аднак менавіта ў 90-я гг. XX ст. пачынаецца якасна новы этап яе дзейнасці: змяняецца кантэнт у эфірных матэрыялах, з'яўляецца ярка выражаная нацыянальная арыентаванасць.

Дзейнасць радыёвяшчання на замежныя краіны была скіравана на суайчыннікаў, беларусаў замежжа. На гэта паказвае падача інфармацыі: журналісцкія матэрыялы часта былі вострымі і праблемнымі, разлічанымі на слухачоў, якія ведаюць кантэкст і цікавяцца надзённымі тэмамі. Праграмы ў эфіры для замежжа пачыналіся тоесным чынам. Адразу выступаў дыктар: «*Вы слухаеце Мінск. Радыёстанцыя «Беларусь»* (яшчэ не замацаваная юрыдычна, гэта назва ўжо прыжылася ў эфіры) *працягвае свае праграмы. Шаноўныя суайчыннікі!* або *Шаноўныя спадарыні і спадары!»* Далей дыктар аб'яўляў імя карэспандэнта, які падрыхтаваў наступны матэрыял, і тэму), пасля слова браў аўтар, інтэрв'юер.

Рыторыку палярнасці часоў Савецкага Саюза паступова змяняла палітыка шматвектарнага развіцця, журналісты закраналі багаты тэматычны спектр, выкарыстоўвалі разнастайныя жанры. У радыёэфіры гучаць навіны і аналітыка пра палітычную і эканамічную сітуацыю ў краіне, паднімаюцца праблемныя пытанні сацыяльнага жыцця, расказваецца пра культуру Беларусі з акцэнтам на яе нацыянальную самабытнасць. На аснове кантэнт-аналітычнага даследавання тэкстаў перадач радыёстанцыі «Беларусь» за 1992 г. была сфарміравана выбарачная сукупнасць матэрыялаў, якія адлюстроўваюць ключавыя тэматычныя кірункі ў тагачасным вяшчанні на замежныя краіны.

**Палітычная сфера.** Тэматыка палітычных паведамленняў вызначалася актуальнай сітуацыяй у краіне. Нядаўняя незалежнасць, шматпартыйнасць, палітычная неўпарадкаванасць, пратэсты, якія падаграваліся складанымі эканамічнымі ўмовамі, – гэтыя тэмы гучалі ў радыёэфіры, скіраваным на замежжа.

У 1991–1996 гг. існаваў вышэйшы пастаянна дзеючы прадстаўнічы і заканадаўчы орган дзяржаўнай улады – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. У радыёэфіры перыядычна з'яўлялася інфармацыя пра яго дзейнасць і пра асоб, якія ўваходзілі ў яго склад. Напрыклад, у жніўні 1992 г. выйшаў матэрыял Н. Хлебус «Знаёмцеся: народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Генадзь Карпенка» гэты матэрыял меў істотную працягласць – ён выйшаў у эфір у трох частках, кожная з якіх доўжылася каля 20 хвілін. Карэспандэнт задавала канкрэтныя, праблемныя і надзённыя пытанні (*Генадзь Дзмітрыевіч, у рэспубліцы шырока вядома Ваша праграма вываду Маладзечна з сацыяльна-эканамічнага тупіка. У чым сэнс і асаблівасць гэтай праграмы? Чаму затрымліваецца вырашэнне зямельнага пытання (статус зямлі: прыватны, дзяржаўны) у рэспубліцы? Сацыяльна-культурнае жыццё вашага горада таксама не замірае? Аднак жа, ёсць у гарадскіх уладаў і праблемы? Распавядзіце, калі ласка, пра маладзечанскую праграму «Адраджэнне». Як*

*вы дасягнулі таго, што ў Маладзечне так цудоўна гучыць родная мова ў штодзённым побыце?)* [1, л. 65–72].

Супрацоўнікі радыё наведвалі і асвятлялі рэзанансныя падзеі ў палітычным жыцці краіны (напрыклад, у эфір выйшаў рэпартаж з мітынгу, прысвечанага Дню беларускай вайсковай славы). Напачатку карэспандэнт дае гістарычную даведку пра бітву пад Оршай 1514 г., перамогу над маскоўскім войскам і пра князя Канстанціна Астрожскага. Пасля ў эфіры гучаць фрагменты мітынгу, урачыстыя выступленні кіраўнікоў палітычных партый і старшыні Беларускага згуртавання вайскоўцаў, даецца частка прамовы былога франтавіка і пісьменніка Васіля Быкава, транслюецца працэс прысягі *(«упершыню ў сучаснай гісторыі вайскоўцы-беларусы прысягнулі свайму народу і дзяржаве»* [2, л. 48]). Між тым, карэспандэнт паведамляе, што «*напярэдадні свята калегія Міністэрства абароны звярнулася да Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з заявай. У ёй свята вайсковай славы беларусаў названа як антыдзяржаўная акцыя, якая стварае прэцэдэнт падзелу паўнамоцтваў дзяржавы і грамадска-палітычных арганізацый у адносінах да ўзброеных сіл*» [2, л. 49–50]. Далей журналіст дазваляе сабе выказаць уласнае меркаванне з дакладнай ацэнкай і акрэсленым эмацыянальным фонам: «*Мне, як чалавеку неваеннаму, незразумела, што ж кепскага ў тым, што людзі выйшлі на плошчу, каб прысягнуць свайму народу і дзяржаве? І чаму да гэтага часу не пыняла прысягу армія, якая сцвярджае, што служыць Рэспубліцы Беларусь? ...*» [2, л. 48].

На пачатку 90-х гг. XX ст. актыўна выкарыстоўвалася такая форма распаўсюджвання інфармацыі, як прэс-канферэнцыя. Мяркуючы па тэматыцы матэрыялаў, прэс-канферэнцыі збіралі рэйтынгавых спікераў, якія закраналі надзённыя тэмы, давалі справаздачы пасля важных мерапрыемстваў, рабілі гучныя заявы (сярод тэм сустракаліся наступныя: Да вынікаў міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД у Бішкеку; Чарнобыль – рана незагойная; Пасля візіту ў ФРГ. Карэспандэнцыя з прэс-канферэнцыі, якую правяла парламенцкая дэлегацыя пасля візіту ў ФРГ). Як бачна з тэм, матэрыялы даволі часта прысвячаліся мерапрыемствам ці падзеям міжнароднага маштабу, дзе адлюстроўваліся працэс афармлення беларускай незалежнасці, узнікненне Беларусі як паўнавартаснай дзяржавы на міжнароднай арэне. Справаздачу паводле вынікаў міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД у Бішкеку карэспандэнт пачынае наступным чынам: «*Сёння, пасля поўнага і канчатковага разбурэння ўсіх усесаюзных структур былога СССР, усім разважлівым, удумлівым палітыкам стала ясна, што без трывалых і пастаянных узаемасувязяў існаваць проста немагчыма. Гэта і паслужыла*

*прычынай таго, як сказаў Старшыня пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па заканадаўству Дзмітрый Булахаў, што пятнаццатага верасня ў Бішкеку адбылося першае пасяджэнне Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў*» [2, л. 72]. У карэспандэнцыі пра Чарнобыль аўтар, між іншым, паведамляе пра тое, што на прэс-канферэнцыю былі запрошаны «*журналісты Беларусі і акрэдытаваныя ў ёй прадстаўнікі масавай інфармацыі Садружнасці Незалежных Дзяржаў ды краін-суседак Літвы і Польшчы*» [2, л. 113].

**Сацыяльна-эканамічная сфера.** Складаная і няўстойлівая пазіцыя беларускай эканомікі на пачатку 90-х гг. XX ст. давала шмат нагод для вострых журналісцкіх матэрыялаў, што было адлюстравана і ў эфіры радыёстанцыі «Беларусь». Пытанні праблемнага характару, датычныя эканамічнай сітуацыі ў краіне, асобным блокам закранаюцца ў матэрыялах на палітычную тэматыку, дзе журналісты гутараць з дэпутатамі Вярхоўнага Савета і іншымі чыноўнікамі.

Эканамічная тэматыка прысутнічае таксама і ў вузкіх, спецыялізаваных матэрыялах. Так, у жніўні 1992 г. журналіст Н. Хлебус праінфармавала пра становішча ў сельскай гаспадарцы: «*З-за небывалай засухі ў большасці гаспадарках Беларусі на кожную галаву буйной рагатай жывёлы назапашана менш, чым палавіна кармоў. Становішча ўскладняецца яшчэ і тым, што павыгаралі, перасохлі пашы, таму скаціну прыходзіцца карміць ужо зараз. ... Працаўнікі сельскай гаспадаркі шукаюць выйсця з гэтай сітуацыі: зараз пачалі масавую паўторную сяўбу азімага жыта, рапсу, свірэпак і яравых крыжацветных культур. ...*» [1, л. 126]. У іншым матэрыяле журналісты задалі пытанне «Як развіваецца дарожная індустрыя ў Беларусі?» ветэрану, «старэйшаму дарожніку Беларусі» і падрыхтавалі тэматычнае інтэрв’ю ў трох частках. Размова пачынаецца ў геапалітычным кантэксце: «*Сёння дарожная індустрыя Беларусі з-за разбурэння гаспадарчых сувязей паміж рэспублікамі былога Савецкага Саюза не можа забяспечыць дарожную галіну неабходнымі машынамі, механізмамі, абсталяваннем. Што ў сувязі з гэтым робяць беларускія дарожнікі?*» [1, л. 139].

Новая на той час для беларускіх СМІ гендарная тэматыка ў эфіры радыёстанцыі «Беларусь» закрана元лася ў міжнародным кантэксце. Журналісты рэдакцыі асвятлялі візіт у Мінск Прэзідэнта Сусветнага жаночага хрысціянскага саюза Ганны-Марыі Чырвонай, пакідаючы ў матэрыяле характэрныя рэмаркі: *«...мы сёння будзем мець магчымасць пазнаёміцца з сусветным жаночым рухам. Я думаю, для нас гэта будзе вельмі карысна, бо мы толькі яшчэ пачынаем працаваць. Нам не хапае інфармацыі, не хапае*

*вопыту*», «*...у нас шмат праблем, яны вельмі спецыфічныя. Але праблемы жанчын падобныя ва ўсім свеце*», «*...зараз мы павінны пабудаваць сваю незалежную нацыянальную дзяржаву. І ад нас, жанчын, у вялікай ступені залежыць лёс гэтай дзяржавы*» [1, л. 87–91].

**Культурная сфера**. Культурная тэматыка ў эфіры радыёстанцыі «Беларусь» на пачатку 90-х гг. ХХ ст. распрацоўваецца ў некалькіх кірунках. Па-першае, вялікая ўвага надаецца адраджэнню беларускай нацыі, гістарычнаму падмурку, на якім паўстала незалежная краіна.

Галоўны рэдактар радыёстанцыі «Беларусь» М. Тондзель звяртаецца да аўдыторыі: «*Шаноўныя суродзічы! Наш народ стаў на шлях нацыянальнага адраджэння. І адзін з самых надзённых і галоўных клопатаў – гэта аднаўленне гістарычнай памяці народа. Бо за гады сталінскага рэжыму было зроблена ўсё, каб знішчыць гістарычную самасвядомасць беларусаў*» (матэрыял «Вярніце беларускаму народу яго гістарычную памяць») [1, л. 54]. Далей аўтар згадвае беларускіх і савецкіх гісторыкаў, параўноўвае іх погляды адносна мінулага нашай краіны, аналізуе недасканаласць савецкіх падручнікаў па гісторыі БССР, прыводзіць факты, якія пацвярджаюць багатае мінулае беларускага народа.

Па-другое, у эфіры рэгулярна выступаюць этнічныя беларусы, якія жывуць у замежжы, асвятляюцца іх візіты ў незалежную Беларусь, рыхтуюцца рэпартажы з іх творчых вечароў. Так, у трох частках у эфіры выйшла размова з госцем радыёстанцыі «Беларусь», «нашым земляком з Канады», пісьменнікам Кастусём Акулам: «*Спадар Кастусь не быў на радзіме каля пятнаццаці гадоў. ... Які лёс, якое жыццё ў Кастуся Акулы, пра гэта мы і пачалі з ім размову. ...*» [1, л. 8].

Па-трэцяе, супрацоўнікамі Галоўнай рэдакцыі радыёвяшчання на замежныя краіны рэгулярна закранаецца тэма духоўнага адраджэння Беларусі ў рэлігійным кантэксце. Так, матэрыял Г. Агалакавай прысвечаны Свята-Успенскаму Жыровіцкаму манастыру. У ім падаецца размова са студэнтамі Мінскай духоўнай семінарыі. Да 1000-годдзя Хрышчэння Беларусі для эфіру радыёстанцыі, арыентаванай на замежную аўдыторыю, падрыхтавана серыя матэрыялаў. Так, Н. Баўкалава паведамляе пра ўрачыстасці, прымеркаваныя да гэтай даты, якія пройдуць па ўсёй краіне, а таксама прыводзіць гістарычныя звесткі, спасылаючыся на айчынных навукоўцаў: «*Якія гістарычныя сведчанні мы маем? Вучоныя-гісторыкі падрыхтавалі шэраг матэрыялаў, вялі грунтоўныя даследаванні і выклалі свае аргументаваныя погляды на калоквіумах, што былі арганізаваны ў Менску праваслаўнай царквой*» [1, л. 15]. У эфіры неаднаразова выступае Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт.

Варта заўважыць, што эфірны час радыёстанцыі «Беларусь» запаўняюць не толькі штатныя супрацоўнікі, гучаць таксама матэрыялы культурных дзеячаў. Напрыклад, у выступленні «Свабода і абавязак» літаратуразнаўца А. Марціновіч разважае пра тагачасную маладую беларускую прозу, аналізуе праблемы, якія ўздымаюць у літаратурных творах маладыя аўтары. Культурныя набыткі Беларусі праяўляюцца таксама і ў забаўляльным складніку вяшчання радыёстанцыі «Беларусь». У вяшчальную сетку ўключана перадача «Агледзіны талентаў Беларусі», дзе слухача знаёмяць з майстрамі народнай творчасці, спевакамі, творчымі калектывамі з усёй Беларусі (сярод тэм сустракаюцца наступныя: радыёнарыс пра выстаўку шкла ў Віцебску, размова з сям'ёй мастакоў Таццянай і Пятром Арцёмавымі; радыёнарыс пра творчае аб'яднанне віцебскіх мастакоў «Квадрат», выстаўку, прысвечаную Малевічу, УНОВІСу, гутарка з майстрамі; радыёрасказ пра фальклорны ансамбль «Свята», размова з яго заснавальнікам Васілём Купрыяненкам, у межах перадачы гучаць народныя песні).

Такім чынам, дзейнасць Галоўнай рэдакцыі радыёвяшчання на замежныя краіны НДТРК Беларусі на пачатку 90-х гг. XX ст. ахоплівала розныя аспекты жыцця новаўтворанай дзяржавы. Тэматычны зрэз эфіру за гэты перыяд паказвае, што журналісты рабілі акцэнт на нацыянальнае станаўленне краіны, звярталі асаблівую ўвагу на нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў і шукалі яе выяўленне ў падзеях, якія на той час адбываліся ў палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах. У вяшчанні на замежныя краіны з'явіліся новыя тэмы (гендар, рэлігія) і пашырылася геаграфія суразмоўцаў (госці з Заходняй Еўропы і ЗША, этнічныя беларусы-эмігранты).

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Архіў НДТРК Беларусі. – № 108. – 1–31 жніўня 1992 г.
2. Архіў НДТРК Беларусі. – № 109. – 1–30 верасня 1992 г.



**Олег СЛУКА**

*Белорусский государственный университет*
*(г. Минск, Беларусь)*


## БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ В ГРАЖДАНСКОМ ОБЩЕСТВЕ


Рассматриваются содержательные вопросы белорусского телевидения, подчеркивается недостаточный уровень художественного мастерства телевизионных журналистов, ограниченность проблематики.